**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

Вучэбна-метадычнае аб’яднанне па гуманітарнай адукацыі

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**

________________
(подпіс)
________________2015 г.
(дата зацвярджэння)
Рэгістрацыйны № ТД-______/тып.

# ТЭОРЫЯ І МЕТОДЫКА МУЗЕЙНАЙ СПРАВЫ

**Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па накірунках)**

**УЗГОДНЕНА**

Старшыня Вучэбна-метадычнага аб’яднання па гуманітарнай адукацыі

________________ С.М. Ходзін
(подпіс)
________________2015 г.
(дата)

**УЗГОДНЕНА**

Начальнік Упраўлення вышэйшай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
________________ С.І. Раманюк
(подпіс)
________________2015 г.
(дата)

**УЗГОДНЕНА**

Прарэктар па навукова-метадычнай рабоце Дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»
________________ І.У. Цітовіч
(подпись)
________________2015 г.
(дата)

Эксперт-нормакантралёр
____________ ______________
(подпіс) (Імя, імя па бацьку, прозвішча)
____________2015 г.
(дата)

Мінск 2015

**УКЛАДАЛЬНІК:**

Гужалоўскі А.А., прафесар кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар гістарычных навук, прафесар

РЕЦЭНЗЕНТЫ:

Кафедра гісторыі Беларусі і музеязнаўства Ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;

Лапцёнак І. Б., намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута культуры Беларусі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, кандыдат філалагічных навук.

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:

Кафедрай этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

(пратакол № 8 ад 07.03.2014 г.);

Навукова-метадычным саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 6 ад 20.06.2014 г.);

Навукова-метадычным саветам па гуманітарных навуках Вучэбна-метадычнага аб’яднання па гуманітарнай адукацыі

(пратакол № 3 ад 01.10. 2014 г.).

Адказны за рэдакцыю: Гужалоўскі А.А.

Адказны за выпуск: Гужалоўскі А.А.

**Змест**

1. Тлумачальная запіска ……………………………………………..4

2. Прыкладны тэматычны план……………………………….....7

3. Змест вучэбнай дысцыпліны…………………………….……..8

4. Інфармацыйна-метадычная частка………………………………17

# 1. Тлумачальная запіска

Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Тэорыя і методыка музейнай справы» прызначана для кіраўніцтва ў сваёй дзейнасці выкладчыка і студэнта. Адметнымі асаблівасцямі дадзенай тыпавой вучэбнай праграмы з'яўляюцца: абноўлены змест, акцэнтацыя на кампетэнтнасным падыходзе ў навучанні, значнае ўзмацненне ролі і долі самастойнай работы студэнта, выкарыстанне сучасных інавацыйных педагагічных тэхналогій. У рамках сумеснага супрацоўніцтва выкладчыка і студэнта праграма выступае своеасаблівым «навігатарам» набыцця ведаў, інфармацыйных і практыкаарыентаваных жыццядзейных уменняў.

Дысцыпліна «Тэорыя і методыка музейнай справы» базіруецца на вывучэнні гісторыі и тэорыі культуры, усеагульнай гісторыі мастацтва, гісторыі матэрыяльнай культуры і з'яўляецца асновай для вывучэння дысцыпліны «Актуальныя праблемы музейнай справы», спецыяльных і факультатыўных дысцыплін.

Тыпавая вучэбная праграма дысцыпліны «Тэорыя і методыка музейнай справы» распрацавана ў адпаведнасці з наступнымі нарматыўнымі і метадычнымі дакументамі:

- Адукацыйны стандарт "Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па накірунках)" зацверджаны і ўведзены ў дзеянне пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30.08. 2013 № 88;
- Парадак распрацоўкі і зацвярджэння вучэбных праграм і праграм практыкі для рэалізацыі зместу адукацыйных праграм першай ступені вышэйшай адукацыі (зацверджана загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 27.05.2013 № 405).

## 1.1. Характарыстыка вучэбнай дысцыпліны «Тэорыя і методыка музейнай справы»

Засваенне навукі прадугледжвае знаёмства з яе базавымі тэарэтыка-метадалагічнымі паняццямі. Гэта тычыцца навукі аб музеях – музеялогіі. Падчас тэарэтыка-метадалагічных даследаванняў ствараецца карціна дзейнасці сучаснага музея як сацыяльна-культурнага інстытута, выяўляецца месца і роля музеяў у сучаснай культуры, аналізуецца вопыт айчынных і замежных музейных устаноў, музеялагічных цэнтраў, органаў кіравання музейнай справай, разглядаецца стан асобай сферы культурнай дзейнасці – музейнай справы. Тэорыя і методыка музейнай справы ўключае ў якасці арганічных структурных частак камплектаванне, уліку, захаванне, ахову, вывучэнне і выкарыстанне музеямі прыроднай і культурнай спадчыны, а таксама рэфлексію гэтых працэсаў. Тэорыя і методыка музейнай справы аб'ядноўвае музейную палітыку (музейнае заканадаўства, арганізацыю

кіравання музеямі, музейнае будаўніцтва), музеялогію (тэорыю і методыку музейнай работы), а таксама музейную практыку (навукова-фондавую, экспазіцыйна-выставачную і культурна-асветніцкую работу).

## 1.2. Мэты і задачы дысцыпліны «Тэорыя і методыка музейнай справы»

**Асноўныя мэты выкладання дысцыпліны:**

- садзейнічанне фарміраванню гарманічнай асобы і навукова абгрунтаванага светапогляду;
- фарміраванне асобы студэнта як грамадзяніна, этнічна талерантнага, з глыбокім разуменнем задач музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны;
- фарміраванне здольнасці да крэатыўнага і крытычнага мыслення ў сацыяльна-пераўтваральнай і прафесійнай дзейнасці, станаўленне сучаснага стылю навукова-практычнага мыслення;
- фарміраванне фундамента музеялагічных ведаў на падставе вывучэння дасягненняў сусветнай і айчыннай музеялагічнай думкі.

**Задачы вывучэння дысцыпліны:**

- даць студэнтам глыбокія веды асноў музеялогіі, выдзяляючы яе спецыфіку, раскрываючы прынцыпы і метады музейнай работы на сучасным этапе развіцця;
- даць студэнтам сістэмныя веды аб найважнейшых аспектах развіцця музейнай справы ў сусветным маштабе;
- пазнаёміць з асноўнымі аспектамі развіцця музейнай справы Беларусі, прадэманстраваць яе асаблівасці ва ўсходнеславянскім кантэксце;
- сфарміраваць у студэнтаў навукова-даследчыя і практычныя навыкі;
- садзейнічаць падрыхтоўцы шырока адукаваных, творчых, з крытычным мысленнем спецыялістаў, здольных да аналізу і прагназавання складаных культурных працэсаў і авалоданню методыкай правядзення культуралагічных даследаванняў.

## 1.3. Патрабаванні да ўзроўню засваення зместу дысцыпліны

**У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен ведаць:**

- асноўныя накірункі дзейнасці сучаснага музея, вектары іх

далейшага развіцця;

- новыя тэхналогіі, якія выкарыстоўваюцца ў музейнай дзейнасці;
- асноўныя паняцці тэорыі і методыкі музейнай справы;
- роль музеяў у развіцці культуры чалавецтва.

**студэнт павінен умець:**

- выкарыстоўваць асноўныя паняцці, законы і фактычны матэрыял па музейнай дзейнасці ў тэарэтычным, метадычным і практычным аспектах;
- аналізаваць крыніцы па музейнай справе Беларусі;
- даць характарыстыку сучасных музейных устаноў, становішча музейнага фонду буйнейшых краін свету;
- аналізаваць развіццё музейнага будаўніцтва ў асобных рэгіёнах і краінах;
- вызначаць месца і ролю музеяў Беларусі ў развіцці сусветнай культуры.

**студэнт павінен валодаць:**

- асноўнымі метадамі тэарэтыка-метадычных музейных даследаванняў;
- крыніцазнаўчымі і метадычнымі прыёмамі вывучэння музейнай справы.

На вывучэнне дысцыпліны «Тэорыя і методыка музейнай справы» разлічана 200 гадзіны, з іх 90 гадзіны аўдыторныя, прыкладнае размеркаванне якіх па відам заняткаў уключае 54 гадзіны лекцый і 36 гадзіны семінарскіх.

## *2.* Прыкладны вучэбна-тэматычны план
## Спецыяльнасць 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)

| Назва модуля | Агульная колькасць аўдыторных гадзін | У тым ліку | |
|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі |
| 1. Агульная характарыстыка музея як сацыяльна-культурнага інстытута, яго функцый, структуры і важнейшых напрамкаў дзейнасці. | 16 | 10 | 6 |
| 2. Камплектаванне, улік, захоўванне фондавых калекцый музея. | 14 | 8 | 6 |
| 3. Вывучэнне музейных прадметаў і калекцый. Навукова-даследчая работа ў музеі. | 14 | 8 | 6 |
| 4. Сучасная музейная экспазіцыя – сінтэз навукі і мастацтва. | 14 | 8 | 6 |
| 5. Музей у сістэме культурна-адукацыйнай работы. | 14 | 8 | 6 |
| 6. Актуальныя пытанні музейнай тэорыі і практыкі. | 18 | 12 | 6 |
| Усяго: | 90 | 54 | 36 |

## 3. Змест вучэбнай дысцыпліны

**Тэма I. Агульная характарыстыка музея як сацыяльна-культурнага інстытута, яго функцый, структуры і важнейшых напрамкаў дзейнасці.**

*1.1. Музей як сацыяльна-культурны інстытут.*

Тэрмін “музей”, вызначэнне паняцця “музей”. Погляды на вызначэнне паняцця З. Странского, Я. Бенеша, М.Ф. Фёдарава і іншых. Паходжанне музея як сацыякультурнага інстытута. Музейная патрэба і яе гістарычнае развіццё. Музей як фактар гістарычнай памяці. Музей і захаванне інфармацыі.

Сацыяльныя функцыі музея, спецыфіка музея як навуковай, адукацыйнай і культурнай установы. Сучаснае разуменне сацыяльных функцый музея. Дыскусійны характар праблемы. Суадносіны функцыі дакументавання, а таксама даследчай, адукацыйна-выхаваўчай і функцыі арганізацыі вольнага часу. Асаблівасці сацыяльных функцый музея, іх узаемасувязь і ўзаемадзеянне, стабільнасць і дынамізм. Характарыстыка музея як навукова-даследчай і навукова-асветнай установы. Класіфікацыя музеяў. Асаблівасці рэалізацыі сацыяльна-культурных функцый музея ў сучасных умовах. Механізмы зменлівасці сацыяльна-культурных функцый. Фактары развіцця музея.

Музеі Беларусі ў XXI стагоддзі. Музеі сістэмы Міністэрства культуры РБ. Нацыянальныя музеі. Музеі-запаведнікі. Музеі пад адкрытым небам. Ведамасныя музеі. Музеі вучэбных устаноў. Карпаратыўныя і прыватныя музеі.

*1.2. Музей як камунікацыйная сістэма.*

Паняцце аб музейнай камунікацыі. Камунікацыйныя мадэлі музея. Сучасныя камунікацыйныя тэхналогіі і практыкі. Праблемы ўкаранення ў сучасную музейную практыку новых камунікацыйных тэхналогій. Музейная камунікацыя і інфармацыйныя тэхналогіі. Электронныя экспазіцыі. Кіраванне камунікацыйнымі працэсамі ў музеі.

Музейны прадмет як падмурак камунікацыі ў музеі. Паняцце музейнага прадмета. Класіфікацыя музейных прадметаў. Уласцівасці і функцыі музейнага прадмета. Класіфікацыя музейных прадметаў, іх інфармацыйная характарыстыка і метады раскрыцця інфармацыйнага патэнцыялу. Вывучэнне музейных прадметаў: атрыбуцыя, класіфікацыя, сістэматызацыя,

музейная інтэрпрэтацыя. Тэрміналагічныя праблемы, звязаныя з музейным прадметам.

**Тэма II. Камплектаванне, улік, захоўванне фондавых калекцый музея.**

*2.1. Працэс камплектавання і яго ўвасабленне ў музейным зборы.*

Паняцце фондавай работы. Паняцце музейнага фонду. Юрыдычны статус музейнага фонду РБ. Музейная калекцыя. Музейны збор. Склад фондаў музея. Асноўныя, дублетныя, абменныя, няпрофільныя фонды; фонд навукова-дапаможных матэрыялаў. Структура фондавых калекцый музеяў. Навуковая арганізацыя музейных фондаў, яе задачы.

Камплектаванне музейных фондаў: формы камплектавання (закуп калекцый, дар, навуковыя камандыроўкі і экспедыцыі, мэтавыя заказы). Арганізацыя і правядзенне тэматычных і комплексных экспедыцый. Методыка збірання гістарычнага матэрыялу. Паняцце музейнага дакументавання. Тэорыя музейнага дакументавання. Ўзроўні музейнага дакументавання. Музейная дзейнасць па навуковаму камплектаванню фондаў. Навуковая канцэпцыя камплектавання фондаў. Музейная мадэль гісторыі і музейная мадэль рэчаіснасці. Аб'екты і крыніцы камплектавання фондаў. Вывучэнне асяроддзя бытавання прадметаў музейнага значэння. Планаванне камплектавання фондаў. Формы камплектавання: мэтанакіраваныя пошукі, выпадковыя паступлення, мэтавыя перадачы. Актуальнае дакументаванне эпохі. Дакументы камплектавання музейных калекцый: палявыя вопісу, дзённікі, акта прыёму, калекцыйныя вопісы. Экспертыза музейных прадметаў, дзейнасць фондава-закупачнай камісіі.

*2.2. Улік і захоўванне фондавых калекцый музея.*

Паняцце ўліку, аховы і захавання музейных фондаў. Улік музейных прадметаў як форма юрыдычнай аховы фондаў і ўмова рэалізацыі ўсіх напрамкаў дзейнасці музея. Дзеючыя інструкцыі па пытаннях уліку музейных фондаў. Асноўныя этапы ўліку фондаў. Навуковая інвентарызацыя і каталагізацыя музейных фондаў. Уліковая дакументацыя. Патрабаванні да арганізацыі ўліку музейных прадметаў з каштоўных металаў і камянёў.

Задачы захавання музейных прадметаў. Сістэма захоўвання музейных фондаў. Рэжым захоўвання музейных фондаў. Дзеючыя інструкцыі па пытаннях захавання музейных прадметаў у фондасховішчах і экспазіцыях. Прафілактыка захоўвання. Важнейшыя патрабаванні да будынкаў музеяў і фондасховішчаў і іх тэхнічнаму абсталяванню. Асноўныя тыпы і віды фондавага абсталявання. Рэжым захоўвання розных відаў музейных прадметаў. Захоўванне музейных прадметаў у экспазіцыі. Праблемы бяспекі музейных фондаў. Кансервацыя і рэстаўрацыя музейных прадметаў.

**Тэма III. Вывучэнне музейных прадметаў і калекцый. Навукова-даследчая работа ў музеі.**

*3.1. Вывучэнне музейных прадметаў і калекцый. Даследаванні ў галіне профільных дысцыплін.*

Паняцце гістарычнай крыніцы. Паняцце помніка (прыроды, гісторыі і культуры). Тыпы і віды гістарычных крыніц. Рэчавыя крыніцы, іх тыпалогія і класіфікацыя. Спецыфіка відаў і тыпаў рэчавых крыніц. Рэчавыя крыніцы як аснова прадметнай камунікацыі. Спецыфіка крыніцазнаўчага аналізу рэчыўных крыніц. Методыка крыніцазнаўчага даследавання рэчавых крыніц розных тыпаў. Музейны прадмет як аснова музейнай дзейнасці. Гістарычныя формы ўспрымання музейнага прадмета. Непрадметные формы помнікаў і іх выкарыстанне ў музейнай справе. Паняцце навукова-дапаможных матэрыялаў. Класіфікацыя навукова-дапаможных матэрыялаў і характарыстыка яго асноўных груп. Збор, захоўванне і выкарыстанне навукова-дапаможных матэрыялаў у экспазіцыйнай і даследчай работы музея. Даследаванні, што праводзяцца музеямі ў галіне профільных дысцыплін (археалогіі, этнаграфіі, нумізматыкі, матэрыяльнай культуры і г. д.).

Паняцце аб кансервацыі і рэстаўрацыі. Роля кансервацыі і рэстаўрацыі ў музейнай справе. Метады кансервацыі. Спецыяльныя методыкі кансервацыі розных відаў і тыпаў музейных прадметаў. Методыка кансервацыі прадметаў з неарганічных матэрыялаў. Кансервацыя прадметаў з арганічных матэрыялаў. Спецыяльныя методыкі рэстаўрацыі музейных прадметаў. Рэстаўрацыя прадметаў з арганічных матэрыялаў. Рэстаўрацыя прадметаў з неарганічных матэрыялаў. Спецыфіка рэстаўрацыі помнікаў пазамузейного размяшчэння (архітэктура, гістарычны ландшафт). Тэхнічныя і мастацкія аспекты рэстаўрацыі.

3.2. *Навукова-даследчая работа ў музеі. Музеялагічныя даследаванні.*

Музей як навукова-даследчая ўстанова. Мэты і задачы даследчай дзейнасці музеяў, яе фінансавае і кадравае забеспячэнне. Асноўныя напрамкі і віды навукова-даследчай работы ў музеях; арганізацыя навукова-даследчай работы ў музеі. Профільныя і няпрофільныя музейныя даследаванні. Асаблівасці музейных навуковых даследаванняў: вывучэнне музейных прадметаў, іх пашпартызацыя і каталагізацыя; навуковыя даследаванні ў галіне тэорыі і практыкі музейнай справы; навуковае праектаванне экспазіцый і выстаў, музейнае крыніцазнаўства, сацыёлага-псіхалагічныя і педагагічныя даследаванні ў музеі. Каардынацыя навуковай работы музеяў з іншымі навуковымі ўстановамі, ВНУ, музеямі, а таксама ўстановамі-партнёрамі. Формы ўводу новых дадзеных у шырокі навуковы зварот (публікацыі, канферэнцыі, навуковыя семінары, іншыя формы). Паняцце навуковай канцэпцыі музея. Музей і краязнаўчыя даследаванні.

Музей, музеялогія, музеяграфія. Аб’ект, прадмет, структура музеялогіі. Музеялогія як навуковая дысцыпліна. Паняційна-тэрміналагічны апарат дысцыпліны. Тэрміналагічнае вызначэнне музеялогіі ў розныя гістарычныя перыяды і цяпер. Сучасны стан тэорыі, методыкі і практыкі музейнай справы. Дыскусія па праблеме трактоўкі прадмета, структуры і задач музеялогіі. Пазіцыі вучоных розных краін. Месца музеялогіі ў сістэме навук. Музеялогія і сумежныя дысцыпліны: архівазнаўства, бібліятэказнаўства, дакументалістыка, інфарматыка і інш. Музеялогія і профільныя дысцыпліны (гісторыя, крыніцазнаўства, археалогія, этнаграфія, мастацтвазнаўства, літаратуразнаўства і г. д.). Праблема ўзаемадзеяння гуманітарных навук і музеялогіі. Музеялогія і псіхалогія, філасофія, сацыялогія, этыка, аксіялогія, гнасеялогія, дыдактыка.

**Тэма IV. Сучасная музейная экспазіцыя – сінтэз навукі і мастацтва.**

*4.1. Станаўленне і развіццё метадаў праектавання музейных экспазіцый.*

Паняцце навуковага праектавання музейнай экспазіцыі. Фармаванне калекцыйнага (сістэматычнага) метада праектавання. Межы яго выкарыстання ў сучаснай музейнай практыцы. Ансамблевы метад у этнаграфічных і мемарыяльных музеях. З’яўленне і развіццё ілюстрацыйнага метада на працягу ХХ стагоддзя. Ілюстрацыйна-дыдактычныя экспазіцыі. Сюжэтна-вобразны праектны метад. Яго сутнасць, перспектывы і абмежаванні. Музейная мова і музейны вобраз.

Экспазіцыйная работа ў музеі і яе арганізацыя: віды работы музея; навуковы характар экспазцыйнай работы; патрабаванні да экспазіцыі; комплекснасць пабудовы; прынцып гістарызму ў пабудове экспазіцыі; адзінства зместу і формы; успрыманне экспазіцыі гледачамі; арганізацыя і планаванне экспазіцыйнай работы.

*4.2. Асноўныя задачы, паняцці, прынцыпы, этапы праектавання музейных экспазіцый.*

Асноўныя задачы і паняцці музейнага праектавання. Асноўныя этапы навуковага праектавання музейнай экспазіцыі і іх характарыстыка. Знаёмства з манаграфічнымі даследаваннямі, перыядычным друкам, архіўнымі і фондавымі матэрыяламі адпаведнай тэматыкі. Напісанне навуковай канцэпцыі экспазіцыі музея (выставы). Тэматычная структура - план зместу і формы будучай экспазіцыі. Асаблівасці тэматычнай структуры плана ў залежнасці ад профілю музея. Методыка стварэння тэматыка-экспазіцыйнага плана (ТЭПа). Характарыстыка асноўных формаў тэматыка-экспазіцыйных планаў музеяў розных тыпаў і профіляў.

Тлумачальны матэрыял. Прызначэнне і віды тлумачальных матэрыялаў у экспазіцыі і іх роля ў разуменні экспазіцыі музея. Этыкетаж і яго роля ў экспазіцыі. Тлумачальныя і арыентацыйныя тэксты ў музейных экспазіцыях.

Методыка афармлення этыкетак для розных відаў экспанатаў. Размяшчэнне тлумачальных матэрыялаў у экспазіцыі.

*4.3. Способы экспанавання музейных калекцый.*

Падбор арыгінальных (аўтэнтычных) матэрыялаў і копій. Значэнне навукова абгрунтаванага падбору матэрыялу экспазіцыі. Роля арыгінальных матэрыялаў у экспазіцыі, неабходнасць іх перавагі над копіямі. Асноўныя віды арыгінальнага музейнага матэрыялу і іх асаблівасці ў залежнасці ад профілю музея: гістарычны, прыродазнаўчы, мемарыяльны, мастацкі, краязнаўчы, і г. д.

Асаблівасці экспанавання зброі, старадрукаў, дакументаў, гравюр, малюнкаў, керамікі, шкла, нумізматыкі, фалерыстыкі, баністыкі, касцюма, карцін, скульптур, фатаграфій.

Копіі ў экспазіцыях, іх роля і значэнне. Характарыстыка асноўных відаў копій – аб’ёмных і плоскіх: аб’ёмныя – макеты, муляжы, мадэлі, гістарычныя рэканструкцыі, панарамы, дыярамы і г. д .; плоскія – фотакопіі арыгіналаў, табліцы, схемы, дыяграмы і г. д. Асаблівасці іх прызначэння, навуковая дакладнасць, мастацкае афармленне.

*4.4. Мастацкае праектаванне музейных экспазіцый. Экспазіцыйны дызайн.*

Архітэктурна-мастацкае рашэнне экспазіцый. Роля мастацкага праектавання ў музеі. Распрацоўка мастацка-архітэктурнага праекта экспазіцыі. Матэрыялы праекта. Асноўныя этапы мастацкага праектавання музейнай прасторы. Асвятленне ў музеі і яго роля ў стварэнні экспазіцыйнага вобразу. Экспазіцыйная мэбля і яе віды. Новыя формы музейнага абсталявання. Методыка мастацкай інтэрпрэтацыі розных экспанатаў. Мантаж музейных экспазіцый. Методыка размяшчэння музейных прадметаў і навукова-дапаможных матэрыялаў у экспазіцыі. Асноўныя элементы экспазіцыйнага дызайна, асаблівасці іх функцыянавання ў музейнай экспазіцыйнай прасторы.

**Тэма V. Музей у сістэме культурна-адукацыйнай работы.**

*5.1. Музей у сістэме адукацыі.*

Асноўныя этапы развіцця культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў. Станаўленне адукацыйна-выхаваўчай сацыяльнай функцыі. Паняцце музейнай педагогікі. Паняцце культурна-адукацыйнай дзейнасці і яе ўзаемасувязь з іншымі напрамкамі дзейнасці музея. Вядучыя прынцыпы навукова-асветніцкай работы музеяў. Каардынацыя культурна-адукацыйнай дзейнасці музея с установамі адукацыі. Арганізацыя і значэнне культурна-адукацыйнай работы ў музеі. Віды гэтай работы: экскурсіі, лекцыі, тэматычныя мерапрыемствы, кансультацыі і г. д. Музейна-педагагічныя праграмы.

*5.3. Музей і публіка.*

Адукацыйна-выхаваўчая работа музея і арганізацыя вольнага часу насельніцтва. Музейная аўдыторыя як аб’ект сацыялагічнага даследавання. Работа музея з рознымі сацыяльна-узроставымі катэгорыямі наведвальнікаў. Спецыфіка работы з дзецьмі, як асноўнага спажывальніка музейных паслуг.

Вызначальная роля экскурсіі ў музеі. Гісторыя зараджэння экскурсійнай практыкі. Планавасць ў арганізацыі экскурсійнай работы ў сучасных музеях. Віды экскурсій: аглядная, тэматычная, вучэбная і г. д. Характарыстыка розных відаў экскурсій, іх асаблівасці ў залежнасці ад профілю музея. Асаблівасці экскурсійнай работы ў залежнасці ад кантынгенту наведвальнікаў. Праца са школьнікамі ў музеі як аснова для паглыблення ведаў, атрыманых на ўроках. Методыка падрыхтоўкі экскурсій. Знаёмства з гістарычнай, спецыяльнай і мастацкай літаратурай па патрэбным пытанням. Знаёмства з архіўнымі і фондавымі матэрыяламі, экспанатамі экспазіцыі музея. Выбар маршруту экскурсіі. План экскурсійнага паказу экспазіцыі музея і яго формы. Стварэнне метадычнага плана-канспекта экскурсіі, формы і віды метадычных дапаможнікаў у экскурсійнай рабоце музея. Методыка правядзення экскурсіі, форма правядзення экскурсіі. Гаворка экскурсавода. Свабоднае валоданне матэрыялам. Тон апавядання.

**Тэма VI. Актуальныя пытанні музейнай тэорыі і практыкі.**

*6.1. Сучасны стан і перспектывы развіцця музейнай сеткі.*

Паняцце музейнай сеткі, яе колькасны і якасны паказчыкі. Структураванне музейнай сеткі РБ паводле юрыдычнага статусу, профільнай прыналежнасці, а таксама тыпу музейных устаноў, яе характарыстыка. Традыцыйныя і інавацыйныя музеі і формы музейнай дзейнасці. Профільныя групы айчынных музеяў – гістарычныя, мастацкія, літаратурныя, тэатральныя, тэхнічныя, прыродазнаўчанавуковыя, галіновыя, комплексныя. Спецыялізацыі гістарычных музеяў – агульнагістарычныя, ваенна-гістарычныя, археалагічныя, этнаграфічныя, гісторыка-культурныя, гісторыка-архітэктурныя, архітэктурна-этнаграфічныя, мемарыяльныя. Асаблівасці спецыялізацыі комплексных музеяў – краязнаўчых, музеяў-запаведнікаў, музеяў-сядзібаў, музеяў-помнікаў, музеяў пад адкрытым небам, музейных аб’яднанняў.

Грамадскія сувязі музеяў. Музей і сродкі масавай камунікацыі. Фактары развіцця музея. Метады аналізу і прагназавання развіцця сеткі музейных устаноў. Структура і асноўныя напрамкі музейнай работы. Музейная прафесія і накірункі яе развіцця: захавальнік, экспазіцыянер (куратар), экскурсавод (музейны педагог), метадыст, мастак (дызайнер), рэстаўратар (кансерватар) і інш.

Дзяржаўная палітыка ў галіне аховы прыроднай і культурнай спадчыны і музейнай справы ў мінулым і на сучасным этапе. Кодэкс прафсійнай этыкі ІКОМ. Музейная права як важнейшая ўмова захавання і выкарыстання

культурнай спадчыны. Заканадаўчыя акты аб музейнай сферы, культурнай спадчыне, ахове помнікаў. Закон "Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь". Праблемы і перспектывы развіцця музейнай сеткі краіны.

*6.2. Новыя тэхналогіі ў музеі.*

Менеджмент як падмурак паляпшэння сістэмы кіравання музейнымі ўстановамі. Кіраванне калекцыямі і праграмамі, адрасаванымі публіцы. Кіраванне фінансамі. Прыцягненне пазабюджэтных крыніц фінансавання (фандрайзінг). Іншыя крыніцы фінансавання (спонсары і ахвярадаўцы). Стварэнне клуба "Сябры музея", Савета папячыцеляў і г. д. Музейная крама: размяшчэнне, дызайн, штат супрацоўнікаў, асартымент тавару, цэнаўтварэнне, падача і дэманстрацыя тавару. Музейная кавярня. Кіраванне ведамі. Інфармацыйнае забеспячэнне развіцця музея.

Канцэпцыя музейнага маркетынгу. Прасоўванне музейных прадуктаў на рынак у сучасных умовах, рэкламная дзейнасць: Internet, кантэкстная рэклама, банэрная рэклама. Фармаванне бюджэту рэкламных кампаній. Паблік рілэйшнз у палітыцы і стратэгіі збыту музейнай прадукцыі; арганізацыя рэкламы і рэкламная палітыка музея, падзеевы маркетынг. Палітыка і стратэгія абслугоўвання наведвальнікаў музея. Прафесійная этыка. Фармаванне карпаратыўнай культуры і іміджу музея як важная частка рэалізацыі стратэгіі развіцця. Крытэрыі поспеху музея; аналіз дзейнасці музея ў адносінах да яго місіі.

Фенамен музейнай камунікацыі і дыверсіфікацыя музейнай дзейнасці ў сучасным грамадстве. Роля музейнай камунікацыі ў сацыяльнай ідэнтыфікацыі наведвальніка. Трансляция культурных узораў як важны элемент музейнай камунікацыі. Сродкі музейнай камунікацыі ў сацыяльнай адаптацыі і адраджэнні каштоўнасцяў. Працэсы мастацкай камунікацыі ў музейнай прасторы. Інтэрнэт-камунікацыі як сродак захавання і трансляцыі культурных каштоўнасцяў. Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі ў музеі. Новыя адукацыйныя тэхналогіі.

*6.3. Праектная дзейнасць у музеі.*

Паняцце праектнай дзейнасці ў музеі, яе задачы і спецыфіка. Структура і змест музейных праектаў. Фінансаванне музейных праектаў. Асноўныя праблемы, на вырашэнне якіх накіраваны музейныя праекты.

Партнёрскія праекты як сродак дасягнення большай адкрытасці, даступнасці, забеспячэння шырокага доступу да інфармацыі ў музеі; узмацнення ролі музея як цэнтра мастацкай, гістарычнай, навукова-тэхнічнай адукацыі; павышэння прэстыжу музея ў грамадстве і прафесіяналізацыі музейных кадраў. Партнёрства беларускіх музеяў з дзяржаўнымі ўстановамі, камерцыйнымі структурамі і некамерцыйнымі арганізацыямі па падтрымцы наватарскіх ініцыятыў у музейнай сферы.

Далейшыя перспектывы і накірункі развіцця праектнай дзейнасці ў музеях як важнейшага сродка ўкаранення інавацыйных форм і метадаў работы. Праекты ў навукова-фондавай, экспазіцыйна-выставачнай,

культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў. Праекты, накраваныя на падрыхтоўку і перападрыхтоўку музейнага персанала.

## 4. Інфармацыйна-метадычная частка

### Структура зместа вучэбнай дысцыпліны

Структураванне зместа вучэбнай дысцыпліны здзяйсняецца праз выдзяленне ў ім узбуйненных дыдактычных адзінак (модуль, раздзел).

Структура зместа вучэбнай дысцыпліны ўключае:
- уводзіны ў дысцыпліну;
- модулі (раздзелы);
- тэмы вучэбных заняткаў;
- заключэнне.

Па кожным вучэбным модулі (раздзеле) у адпаведнасці з яго мэтамі і задачамі па фармаванню і развіццю ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчыкам (кафедрай) праектуюцца і рэалізуюцца пэўныя педагагічныя тэхналогіі. У ліку найбольш перспектыўных і эфектыўных сучасных інавацыйых адукацыйных сістэм і тэхналогій, якія дазваляюць рэалізаваць сістэмна-дзейнасны кампетэнтнасны падыход у навучальна-выхаваўчым працэсе, трэба вылучыць: вучэбна-метадычныя комплексы; варыятыўныя мадэлі самастойнай працы студэнтаў, блочна-модульныя, модульна-рэйтынгавыя і крэдытныя сістэмы, інфармацыйныя тэхналогіі, методыкі актыўнага навучання.

За аснову структуры тыпавой праграмы ўзяты модуль, які ўяўляе сабой узбуйненую і цэласную дыдактычную адзінку працэса навучання і зместа, які мае адносна завершаны характар.

### Рэкамендуемыя метады (тэхналогіі) навучання

У ліку эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць прыцягненню студэнтаў да пошуку і кіраўніцтва ведамі, набыццю вопыта самастойнага вырашэння разнастайных задач, патрэбна вылучыць:
- тэхналогіі праблемна-модульнага навучання,
- тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці,
- праектныя тэхналогіі,
- камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусія, прэсканферэнцыя, мазгавы штурм, вучэбныя дэбаты і іншыя актыўныя формы і метады),
- метад кейсаў (аналіз сітуацыі),
- гульневыя тэхналогіі, у рамках якіх студэнты ўдзельнічаюць у дзелавых, ралявых, імітацыйных гульнях, і інш.).

Мэтазгодна ўкараняць у практыку правядзення семінарскіх і практычных заняткаў методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы ў мэтах фарміравання сучасных сацыяльна-асобасных і

сацыяльна-прафесійных кампетэнцый выпускніка ўстановы вышэйшай адукацыі.

**Самастойная работа студэнтаў**

Самастойная работа студэнтаў – мэтанакіраваная вучэбная дзейнасць студэнтаў, якая здзяйсняецца пад непасрэдным ці апасродкаваным кіраўніцтвам выкладчыка.

Мэтай самастойнай работы студэнтаў з’яўляецца павышэнне канкурэнтназдольнасці выпускнікоў установы вышэйшай адукацыі праз фармаванне ў іх кампетэнцый самаадукацыі.

Кампетэнтнасны падыход прадугледжвае ўзмацненне практыкаарыентаванасці адукацыйнага працэса і ролі самастойнай дзейнасці студэнтаў па вырашэнні задач і сітуацый, якія імітуюць сацыяльна-прафесійныя праблемы. Самастойная работа студэнтаў прадугледжвае выкананне кантрольных работ, падрыхтоўку рэфератаў, азнаямленне з навуковай, навукова-папулярнай, хрэстаматыйнай літаратурай, напісанне эсэ, курсавых работ, аналіз канкрэтных сітуацый і інш.

**Дыягностыка прафесійных і сацыяльна-асобасных кампетэнцый студэнта**

Патрабаванні да здзяйснення дыягностыкі

Вызначаецца наступная працэдура дыягностыкі дасягненняў (кампетэнцый) студэнта:

- вызначэнне аб’екта дыягностыкі;
- выяўленне факта вучэбных дасягненняў студэнта з дапамогай крытэрыяльна-арыентаваных тэстаў і іншых сродкаў дыягностыкі;
- вымярэнне ступені адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта патрабаванням стандарта;
- ацэньванне вынікаў выяўлення і вымярэння адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта патрабаванням стандарта (з дапамогай шкалы ацэнак).

Шкалы ацэнак

Ацэнка вучэбных дасягненняў студэнта на экзаменах праводзіцца па дзесяцібальнай шкале.

Ацэнка прамежкавых вучэбных дасягненняў студэнтаў, якая выконваецца паэтапна па канкрэтных тэмах ці модулях вучэбнай дысцыпліны, здзяйсняецца кафедрай у адпаведнасці з абранай установай вышэйшай адукацыі шкалой ацэнак (дзесяцібальнай, стобальнай).

Дыягнастычны інструментарый

Для дыягностыкі кампетэнцый, выяўлення вучэбных дасягненняў студэнтаў пры прамежкавым і выніковым ацэньванні (залік, экзамен) рэкамендуецца выкарыстоўваць:

- тэсты;
- комплексныя кантрольныя работы з рознаўзроўневымі заданнямі;
- залік;
- экзамен.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен умець ажыццяўляць пошук, сістэматызацыю і аналіз інфармацыі па тэорыі і методыцы музейнай справы, выкарыстоўваць гэтую інфармацыю з мэтай укаранення новых тэхналогій і інавацый у сучасную музейную дзейнасць, фармуліраваць і прапанаваць новыя ідэі ў галіне.

## АСНОЎНАЯ ЛІТАРАТУРА

1. Музееведение. Музеи исторического профиля. М., 1988.
2. Музеи в период перемен. Спб., 1997.
3. Майстровская М.Т. Музейная экспозиция. Искусство – архитектура – дизайн. Тенденции формирования. М., 2000.
4. Музеі Беларусі. Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі. Мн., 2008.
5. Поляков Т.П. Мифология музейного проектирования. М., 2003.
6. Музей будущего: Информационный менеджмент. М., 2001.
7. Основы музееведения. Под ред. Э.А. Шулеповой. М., 2010.
8. Юренева Т.Ю. Музееведение. М., 2003.
9. Сотникова С.И. Музеология. Учебное пособие. М., 2005.
10. Юренева Т.Ю. Музеи мира: история и коллекции, шедевры и раритеты. М., 2011.

### ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА

11. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб музеях і Музейным фондзе

Рэспублікі Беларусь». 12 снежня 2005 г. № 70-З. 2005.

12. Калбаска А. Музейны дыярыуш, ці Уваходзіны ў новую музеялогію. Мн., 2000.

13. Российская музейная энциклопедия. В 2 т. М., 2001.

14. Музееведческая мысль в России XVIII–XX вв. : сб. документов и материалов / отв. ред. Э.А.Шулепова. М., 2010.

15. Музейное дело России. Под ред. М. Е. Каулен. М., 2003.

16. Решетников Н.И. Музееведение. Курс лекций. М., 2000.

17. Столяров Б.А., Соколова Н.Д., Алексеева Н.А. Основы экскурсионного дела. СПб., 2002.

18. Тельчаров А.Д. Основы музейного дела. Введение в специальность. Курс лекций. М., 2005.

19. Юренева Т.Ю. Музей в мировой культуре. М., 2003.

20. Шляхтина Л.М., Фокин С.В. Основы музейного дела: Учебное пособие для студентов педагогических и гуманитарных вузов. Спб., 2000.